

# Урок 81

Дапоўні разважанне.






1. **Першае няпоўнае дзялімае — ... .**
   У запісе дзелі будуць ... лічбы.
   Дзялю ... . Множу ... .
   Аднімаю ... . Параўноўваю ... .
   Астача роўная ... .
2. **Другое няпоўнае дзялімае —** 0 соцень.
   Дзялю ... . Множу ... . Аднімаю ... .
   Параўноўваю ... .
3. **Трэцяе няпоўнае дзялімае —** ... .
   Дзялю ... . Множу ... . Аднімаю ... . Параўноўваю ... .
   Засталося падзяліць … . Буду іх дзяліць … .
4. **Чацвёртае няпоўнае дзялімае —** ... .
   Дзялю ... . Множу ... . Аднімаю ... . Параўноўваю ... .
5. Чытаю адказ — ... .

**1.** Вылічы.

5035 : 5   21 063 : 7   36 045 : 9   48 048 : 6

**2.** Вылічы.

5 м 2 дм 9 см + 4 м 9 дм 8 см   70 кг 845 г : 3
12 т 5 ц 8 кг + 45 ц 7 кг   284 ц 83 кг : 7
21 дм + 4 м 72 см – 2 м 8 см   263 км 912 м : 4

**3.** Сума двух лікаў роўная 6420. Адзін з іх у пяць разоў большы за другі. Знайдзі гэтыя лікі.

**4.** Маса малатка роўная $\frac{1}{2}$ кг, а адвёрткі — $\frac{1}{10}$ кг. Знайдзі масу двух малаткоў і масу дзесяці адвёртак.



Правообладатель Национальный институт образования

**5.** У пяці аднолькавых наборах 1450 шруб. Майстар купіў 870 шруб у такіх наборах. Колькі набораў са шрубамі ён набыў?

**6.** З пасёлкаў *C* і *D*, адлегласць паміж якімі 62 км, насустрач адзін аднаму адначасова выехалі два веласіпедысты. Той, хто ехаў з пасёлка *C*, рухаўся са скорасцю 14 км/г. З якой скорасцю ехаў другі веласіпедыст, калі яны сустрэліся за 28 км ад пасёлка *C*?

**7.** На чарцяжы паказаны памеры падлогі ў магазіне, якую майстар павінен выкласці зялёнай пліткай квадратнай формы. Колькі плітак яму трэба купіць, калі даўжыня стараны пліткі роўная 2 дм?




Колькі лічбаў будзе ў дзелі?

120 147 : 3

**1.** Рашы ўраўненні.

10 045 : $a$ = 5 45 054 : $c$ = 9 7 · $b$ = 5264 · 4

**2.** У спартыўным цэнтры ўстанавілі 2 аднолькавыя кулеры з вадой на першым паверсе і 3 такія ж кулеры на другім паверсе. Усяго ў гэтых кулерах 95 л вады. Колькі літраў вады змяшчаецца ў кулерах на кожным паверсе?



Правообладатель Национальный институт образования